*Дыдактычны матэрыял для вуснага курса беларускай мовы ў І класе ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання.*

***Віктар Кажура, Ангеліна Прохарава***

# Слоўнік першакласніка

## Я І МАЯ ШКОЛА

### Школьныя памяшканні

Тут за кожнымі дзвярамі
Ёсць свае сакрэты.
Разгадаем мы іх самі
Ў доме светлым гэтым.

**Настаўніцкая** *(рус. учительская)*

— Як мяркуеце, чаму
Той пакой завуць настаўніцкай?
Таня кажа: «А таму,
Што настаўнікі тут раяцца».

Настаўніцкая — пакой у школе, дзе збіраюцца і адпачываюць настаўнікі падчас перапынкаў паміж урокамі.

**Бібліятэка** *(рус. библиотека)*

Гэта ў школе — не бакоўка,
Гэта — розуму кладоўка.
— Што цікавіць сёння вас?
Бібліятэка дасць адказ.

Бібліятэка — установа, якая збірае і захоўвае кнігі для грамадскага карыстання.

**Сталовая**
*(рус. столовая)*

Ну як сталовую мінуць,
Дзе боршч, ды каша, ды катлеты?
Сюды ўсе з радасцю ідуць —
Маршрут усім вядомы гэты.

Сталовая — асобны пакой у школе, дзе ядуць.

**Спартыўная зала**
*(рус. спортивный зал)*

Каб прывабна, стройна, стыльна
І зайздросна выглядаць,
Вам у зале у спартыўнай,
Трэба шмат папрацаваць.

Спартыўная зала — вялікае памяшканне для заняткаў спортам.

### Вясёлы перапынак

Зноў на ўроку не сядзіцца
Гэтай тройцы гаманкой —
Рупіць хлопцам падзяліцца
Незвычайнай навіной.

**На перапынак**

Дазвінеў ледзь-ледзь званок,
Кліча з класа нас Пятрок
Ды загадкава міргае —
Нас сюрпрыз якісь чакае.
(Мусіць, час той не настаў,
Каб Пятрок хоць дзень маўчаў.)
Расказаць ён нам павінны
Небывалыя навіны
Альбо дзіўныя дзівосы,
Што пабачыць давялося.

**На рыбалцы**

Ну, скажыце, сябрукі:
Хто рыбалку любіць?
Хто з вас, хлопцы, рыбакі?
І хто рыбу вудзіць?
Што, няма між вас, сябры,
Шчырых ды заўзятых,
Хто на рэчцы ад зары
Бавіць нават святы?
Шмат вы страцілі тады,
Шчасця не заспелі,

Калі з вудай ля вады
Хоць разок не селі.
Кожны скажа вам рыбак:
— Як жа шчасця многа!
Бо трымаеш на руках
Шчупака жывога.
А шчупак той — будзе з пуд,
Як дакладна ўзважыш.
Во дзе рыба! Во дзе цуд!
Лепей і не скажаш.
Вось! Да сёння маю знак —
Той гігант пакінуў.
Толькі... вырваўся шчупак
І між хваль ён згінуў.

**У вандроўках**

Глянь, спакойнага Кірыла
Байка Пеці зачапіла:
— Ну, скажыце мне, каторы
З вас наведаў рэкі, моры?
Капітанам за штурвалам
Бітву вёў з дзявятым валам?
І з кітом не раз страчаўся,
Ды не кінуў, не спужаўся,
Моцна свой штурвал трымаў,
Курс надзейны вызначаў?
Не было такой нагоды?
А вось я свае прыгоды
Не хачу хаваць ад вас.
Толькі будзе мой расказ,
Можа, трошкі незвычайны,
Бо не ўсе свае я тайны
Вам сягоння пакажу.
Лепей заўтра раскажу,
Як на выспу заплылі,
Лета ўсё там правялі...

**На будаўніцтве**

А Сяргейка аж гарыць —
Хоча так пагаварыць:
— Не паверыце: мы з татам
Узвялі за лета хату.
Да зары штодня ўставалі —
З мазалямі сябравалі.
Працавалі спрытна, лоўка —
Глянь, раўнюткая пляцоўка,
Каб фундамент заліваць,
Дачу нашу будаваць.
А прывезлі ж нам бярвенне,
Дык сваё старанне-ўменне
Мы вяскоўцам паказалі,
Як на сценах працавалі,
Ды на іхніх на вачах
Накрывалі шчыльна дах.
А пасля яшчэ турботы:
Унутры было работы...
Дык цяпер магу хваліцца,
Што на летнік падзівіцца
Кожны дзень прыходзяць людзі,
Кажуць: «Хай жа шчасце будзе
Тым, хто працай славіцца,
З цяжкасцямі справіцца».

**У малінах**

Тут гарэзна прагучаў
Галасок Марыны:
— Хто з вас сонейка страчаў
Між кустоў маліны?
Хто там з голля пастрасаў
Дыяменты-росы?
Гэта ж ягады збіраў
Буры мішка босы.
Ягад многа ён пабраў,
Ды і мне пакінуў
— На варэнне вам, — казаў, —
Гэтыя маліны.
А тых ягад — не сабраць:
Гнуцца аж галіны.
Як жа можна пакідаць
Той дэсерт дзяціны?!
Дык сабралі тры вядры,
Можа, з палавінай...
Вось такі быў дзень, сябры:
Мішка, лес, маліны,

**На ўрок**

Дзеці, чуеце: званок
Кліча вас за парты.
Вось закончыце ўрок —
Зноў пачнуцца жарты.
Будзе зноўку вам Пятрок
Баяць небыліцы...
А цяпер — пара на ўрок —
Будзем зноў вучыцца.

## Вучэбныя заняткі

Трэба слухаць ды вучыцца,
Назіраць, запамінаць,
Каб нідзе не памыліцца
І адказ праўдзівы даць.

**Вераб'я** дзядок пытае:
— Дзе ты, жэўжычак, жывеш?
Хоць унук малы, а знае:
— У гняздзечку нумар **шэсць**.

* * *

— Хто, скажы, **катам** ніколі
Не дае спакою ў полі,
І на вуліцы, і ў хаце?
Як ён будзе называцца?
— Сустракаў таго я звера,
Шмыгнуў хутка ён за дзверы,
Ад мяне паспеў схавацца.
**Мышкай** звер той будзе звацца.

**Якая літара лепшая**

— Што ты каркаеш, варона,
Быццам жалішся ўсё роўна?
Ці, мо, арыі спяваеш
Ды пра «**а**» не забываеш?
— Верабейка, лепш маўчы.
Бо заладзіў: «**Ч**ы-**ч**ы-**ч**ы!»
Памяняй лепш свой матыў
На вясёлы: «Ціў-ціў-ціў!»
І тады да вечнай «**ч**э»
«Цэ» дабавіцца яшчэ.

**Расклад урокаў**

— З панядзелка да суботы
Многа ў школе нам работы.
Як яе перарабіць
І пра нешта не забыць?
Заўтра, скажам, панядзелак,
Прыйдзе ён пасля нядзелі.
А нядзеля — выхадны:
Гулі, забаўкі адны.
Дык не дзіва: я забыў
І заданне... не зрабіў.
Потым прыйдзе і аўторак —
Працы, мусіць, будзе болей...
Як жа тут не сумаваць?
І з чаго мне дзень пачаць?
— Сабярыся лепей, брат, —
Ты ж забыўся... на **расклад**.
Сёння дзень які? Чацвер?
Значыць, мова ў нас цяпер.
Матэматыка — услед,
«Чалавек» за ёй і «свет».
А працоўным навучаннем
Дзень закончым...
Кожным раннем,
Як збіраешся на ўрок,
Не кладзі **«Расклад»** убок.
Бо з памочнікам-раскладам
Пойдуць справы чынам-ладам,
Каб урокі ўсе зрабіць
І на вуліцы пабыць.